# Нашы юбіляры

## АЛЕГ АНТОНАВІЧ ЛОЙКА



Споўнілася 60 гадоў вядомаму беларускаму вучонаму, пісьменніку, крытыку, паэту Алегу Антонавічу Лойку. З 1953 г. ён, выпускнік Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, звязаў сваё жыццё з філалагічным факультэтам. Тут скончыў аспірантуру, паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1959 г.— доктар філалагічных навук, з 1970 — прафесар. З 1956 г. працуе на кафедры беларускай літаратуры, з 1985 г.— яе загадчык, з 1991 г.— дэкан філалагічнага факультэта.

Член-карэспандэнт АН БССР Алег Антонавіч Лойка — вучоны шматграннага таленту. Ён глыбока і ўсебакова даследаваў творчасць М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, прысвяціўшы кожнаму з іх асобныя манаграфіі, якія прынеслі яму вядомасць на Беларусі і за яе межамі. Яго пяру належаць дзве кнігі — «Янка Купала» (1982) і «Скорина» (1989), якія выйшлі ў серыі ЖЗЛ. А. А. Лойку ўласцівы тонкі пераход ад вузкаспецыяльных праблем паэтыкі да літаратурнага краязнаўства, ад глыбокіх аналітычных прац да папулярных артыкулаў і нарысаў, прызначаных для шырокага кола чытачоў. Яркі лектарскі талент вучонага-педагога, уменне вучыць, не павучаючы — сапраўдныя ўрокі для маладога пакалення філолагаў, ды і не толькі філолагаў. Яго спецыяльныя курсы па гісторыі літаратуры і семінары — высокі інтэлектуальны, маральны, эстэтычны прыклад служэння навуцы. А. А. Лойкам створаны шэраг падручнікаў, праграм, навуковых дапаможнікаў, хрэстаматый, многія з якіх неаднаразова перавыдаваліся. Сярод іх двухтомная «Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд» у двух тамах (І-е выданне: Ч. І — 1977, Ч. 2 — 1980; ІІ-е выданне: Ч. 1, 2—1989), «Хрэстаматыя беларускай літаратуры XIX стагоддзя» (1971, 1988) і інш.

А. А. Лойка падрыхтаваў 10 кандыдатаў філалагічных навук, яго вучні, паслядоўнікі працуюць у навукова-даследчых інстытутах, ВНУ, школах, літаратурных музеях, архівах, бібліятэках. Шмат гадоў ён з'яўляецца кіраўніком літаратурнатворчага аб'яднання «Узлёт», з якога выйшлі таленавітыя беларускія паэты і празаікі.

Вядомы беларускі паэт і перакладчык, ён выдаў звыш дваццаці арыгінальных зборнікаў паэзіі, тры кнігі выбранага, кнігі перакладаў П. Верлена (1974), І. В. Гётэ (1981). Творы А. А. Лойкі перакладзены на многія мовы народаў СССР, а таксама на польскую, англійскую, французскую, балгарскую і інш. Песні, рамансы, танга на вершы і музыку паэта і кампазітара гучаць у розных кутках Беларусі. Паэзію А. А. Лойкі вызначаюць тонкі лірызм, уменне спасцігнуць і данесці да чытача тое спрадвечнае і вечнаснае, што заўсёды хвалявала і ўзбуджала чалавека на добрае, чыстае, узвышанае. Крыніцы натхнення паэта — наш край, яго маленькая радзіма Слонімшчына з яе векавечнымі дубамі, гордаю Шчараю, вузенькімі вулачкамі старога горада... Крывічы, Загалічы, дзе прайшло дзяцінства, дзе магілы далёкіх прашчураў.

У дні святкавання 500-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны А. А. Лойка выступаў з дакладамі на канферэнцыях, сімпозіумах у БДУ, АН БССР, у Калоннай зале Дома Саюзаў, а таксама за мяжою — у Польшчы, Чэха-Славакіі і Францыі. Яго раман-эсэ «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае»

адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР за 1990 г. А. А. Лойка ўзнагароджаны ордэнам Дружбы народаў (1971), дзвюма Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета БССР (1971, 1980), трыма медалямі.

**У. Г. Кароткі**

# РЫГОР ВАСІЛЬЕВІЧ БУЛАЦКІ



5 мая споўнілася 70 гадоў з дня нараджэння Рыгора Васільевіча Булацкага, доктара гістарычных навук, прафесара кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры БДУ імя У. І. Леніна. Нарадзіўся ён у вёсцы Мачулкі, што на Бабруйшчыне, у вялікай сялянскай сям'і. З 1929 па 1939 гг. вучыўся ў школе.

Вучобу ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна перарвала Вялікая Айчынная вайна, якая закончылася для яго 13 мая 1945 г. у Чэха-Славакіі. Авіяцыйны ваенны штурман, Рыгор Булацкі ў час вайны быў кантужаны, цяжка паранены.

Толькі ў 1946 г. Рыгор Васільевіч змог вярнуцца да вучобы ў БДУ. Фактычна з гэтага часу ўсё далейшае яго жыццё звязана з родным універсітэтам. Пасля заканчэння ў 1951 г. факультэта журналістыкі рэдагаваў газету «Беларускі універсітэт», вучыўся ў аспірантуры, працаваў старшынёй прафкома, сакратаром парткома універсітэта. У 1954 г. Р. Булацкі абараніў кандыдацкую дысертацыю і стаў выкладчыкам кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкай журналістыкі. Тут праявіліся яго выдатныя арганізатарскія здольнасці. Ён працаваў загадчыкам кафедры, намеснікам дэкана, дэканам факультэта.

У 1971 г. Р. В. Булацкі абараніў доктарскую дысертацыю, якую прысвяціў публіцыстыцы У. І. Леніна, і стаў прафесарам. За гады работы на факультэце журналістыкі выдаў каля 20 манаграфій, зборнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, больш як 200 навуковых артыкулаў. Манаграфіі Р. В. Булацкага «Ленинской гвардии солдат» (2 выданні), «П. Н. Лепешинский», «Первые рабселькоры Белоруссии», «Оружием слова», «К. С. Еремеев, революционер, публицист» і інш., вядомыя ў рэспубліцы і краіне, з'явіліся значным укладам у развіццё гісторыі, тэорыі і практыкі журналістыкі. За дапаможнік «Гісторыя беларускай журналістыкі» (Мн., 1979), напісаны ў сааўтарстве, Р. В. Булацкі ў 1980 г. атрымаў прэмію Саюза журналістаў СССР.

Прафесар Р. В. Вулацкі доўгі час з'яўляўся членам навукова-метадычнага савета па журналістыцы пры Камітэце па народнай адукацыі СССР, членам Праўлення Саюза журналістаў БССР, членам савета універсітэта, намеснікам, а затым і старшынёй савета па прысваенню вучонай ступені кандыдата і доктара навук. Пад непасрэдным кіраўніцтвам Р. В. Булацкага абаронена звыш 30 кандыдацкіх і 3 доктарскія дысертацыі. Шмат гадоў працуе Р. В. Булацкі ў саставе рэдакцыйнай калегіі «Весніка БДУ. Серыя IV».

Ратны і працоўны шлях Р. В. Булацкага адзначаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны, «Знак Пашаны», медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

70 гадоў — гэта ўзрост сталасці. Але па-ранейшаму свае веды, багаты жыццёвы вопыт Рыгор Васільевіч перадае маладым журналістам. Выкладчыкі і студэнты факультэта журналістыкі шчыра віншуюць юбіляра і жадаюць дарагому Рыгору Васільевічу доўгіх гадоў жыцця, асабістага шчасця, добрага здароўя і новых творчых здабыткаў.